

ЧАМУ ВУЧЫЦЬ ВАЛАНЦЁРСТВА? **3**



ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ У КАРЦІНАХ **6**

30 САКАВІКА 2024 г. СУБОТА

№ 64 (30198)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

**Наталля КАЧАНАВА:**

## «Духоўна-маральныя каштоўнасці дапамагаюць ствараць базіс грамадзянскай ідэнтычнасці»

### Важная размова на вельмі важную тэму

**Грамадска-дзяржаўнае партнёрства ў захаванні духоўна-маральных каштоўнасцяў сучаснага грамадства — тэма настолькі рознабаковая і глыбокая, што абмяркоўваць яе можна пастаянна і кожны раз выносіць новыя важныя пасылы. Менавіта гэтай тэме было прысвечана выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі. Яно прайшло ў месцы, прасякнутым духоўнасцю, — у Свята-Елісавецінскім манастыры. Кола ўдзельнікаў толькі членамі Савета Рэспублікі не абмежавалася. Разам з сенатарамі ўдзел у абмеркаванні важнай тэмы прынялі кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, намеснікі старшынь аблвыканкамаў, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, рэктары ўніверсітэтаў, моладзь.**



Фота БелТА.

Адкрываючы пасяджэнне, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава згадала цытату Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі: «Беларусь — краіна вялікай культуры, найбагацейшай гістарычнай спадчыны, шматвяковых духоўна-маральных традыцый і невычэрпнага творчага патэнцыялу». Наталля Качанава звярнула ўвагу, што агульная задача ўсіх беларусаў — усяляк садзейнічаць захаванню і прымнажэнню гэтых каштоўнасцяў, якія народ Беларусі ствараў і развіваў на працягу шматвяковай гісторыі.

«У вечным пошуку станоўчага і добрага непарушнымі арыенцірамі выступаюць агульначалавечыя каштоўнасці і ідэалы. Бо маральнасць — гэта і ёсць жыццё чалавека. Гэта тое, што фарміруе ўнутраны стрыжань асобы, вызначае пачуцці, характар думак. А ад духоўнасці залежыць будучыня грамадства. Духоўна-маральныя каштоўнасці дапамагаюць ствараць базіс грамадзянскай ідэнтычнасці — прыналежнасць да сваёй Радзімы і гонар за яе, павага да яе гісторыі. Выхаванне на аснове гэтых каштоўнасцяў далучае да культурных традыцый свайго народа, прыяе развіццю працавітасці, павагі да людзей, прывівае любоў да сям'і, Айчыны, навакольнага свету. Дзякуючы духоўна-маральнаму выхаванню фарміруюцца пачуцці сумленнасці, спачування, суперажывання і даверу, выяўляюцца высокія маральныя якасці: дабрыня, міласэрнасць, сумленнасць, справядлівасць — усё тое, што называецца чалавечнасцю», — падкрэсліла спікер.

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што сёння, на жаль, людзі часта абыякавыя да таго, які след пакінуць пасля сябе на гэтай зямлі. Змена каштоўнасцяў адбываецца далёка не ў лепшы бок. Сацыяльнай нормай лічыцца грамадзянскі шлюб, свядомая адмова ад нараджэння дзяцей, наўмысная адзінота. Кнігі і жывыя чалавечыя зносіны падмяняюцца сацыяльнымі сеткамі, акунаннем у сусветнае павуцінне, сыходам ад рэальнасці. Духоўныя каштоўнасці выцясняюцца асабліва вузкаасабістымі, «харчова-рэчавымі» жаданнямі, спажывецкім стаўленнем да ўсіх і да ўсяго.

СТАР. 2

# СВЯТА РАДАСЦІ І НАДЗЕІ

*Хрысціянам Беларусі,*
*якія святкуюць Вялікдзень 31 сакавіка 2024 года*

***Дарагія суайчыннікі!***

***Шчыра віншую вас са святам Вялікадня.***

***Яно нясе ў сабе глыбокі сэнс жыватворнай веры ў вечныя ідэалы дабра і справядлівасці.***

***Уваскрэсенне Хрыстова аб'ядноўвае нас вакол сапраўдных хрысціянскіх каштоўнасцяў, вяртае да спрадвечных якасцяў беларускага народа: самаахвяравання, брацкай узаемадапамогі і імкнення служыць роднай зямлі.***

***У велікодныя дні сэрца кожнага верніка перапаўняецца вялікай радасцю, якая ўмацоўвае дух, усяляе надзею на светлую будучыню.***

***Няхай Вялікдзень натхняе вас на добрыя справы і напаўняе жыццё любоўю. Моцнага здароўя, шчасця, міру і згоды вам і вашым блізкім.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«З упэўненасцю магу адзначыць, што ўстойлівасць адкрытай беларускай эканомікі ў многім забяспечана пераарыентацыяй экспарту з заходніх рынкаў, якія закрыліся з-за санкцый, на рынкі еўразійскага рэгіёна. І такая рэзультатыўная пераарыентацыя стала магчыма дзякуючы глыбокай эканамічнай інтэграцыі Беларусі з дзяржавамі — партнёрамі па СНД і ЕАЭС, а таксама і ШАС, над набыццём паўнапраўнага членства ў якой Беларусь працягвае працаваць».*

Цуд жыцця

# ЖАДАННІ СПРАЎДЖВАЮЦЦА!

### Шматразовая чэмпіёнка Беларусі па спартыўных танцах на калясках Ірына Мінюк нарадзіла дачку

**Гэта ўжо другое дзіця ў сям'і спартсменкі з Івацэвічаў. На выпіску з радзільнага дома сустракаць маладую маці з нованароджанай Каралінай прыехалі яе муж Юрый і старэйшы сын 11-гадовы Максім. Павіншаваць падапечную прыйшоў і кіраўнік Беларускага фонду дапамогі спартсменам-інвалідам Валерый Каламіец, які расказаў, што ў сем'ях яго выхаванцаў за апошнія гады нарадзілася 25 дзяцей.**

Традыцыйны бела-ружовы карункавы «канверт», які медработнікі ўрачыста ўручаюць тату, цёплыя абдымкі з роднымі — і слёзы нават на вачах журналістаў, не кажучы пра блізкіх. Ірына, як і належыць сапраўднай спартсменцы, хутка спраўляецца з эмоцыямі і гатова падзяліцца ўражаннямі:

СТАР. 3



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Страты замежных кампаній ад сыходу з Расіі перавысілі $107 млрд

Замежныя кампаніі, якія сышлі з расійскага рынку пасля пачатку канфлікту ва Украіне, страцілі больш чым 107 мільярдаў долараў, паведаміла Reuters. Пры гэтым аб'ём страт павялічыўся на трацінy з моманту апошняга падліку ў жніўні 2023 года, што «ўказвае на маштаб фінансавага ўдару па карпаратыўным свеце». «Кампаніі, якія ўсё яшчэ імкнуцца пакінуць Расію, хутчэй за ўсё, сутыкнуцца з далейшымі цяжкасцямі і будуць вымушаны змірыцца з вялікімі спісаннямі і стратамі», — папярэдзіў Ян Мэсі з кансалтынгавай кампаніі па глабальных рызыках S-RM. Паводле даных Ельскай школы менеджменту, каля тысячы замежных кампаній сышлі з Расіі з лютага 2022 года, хаця сотні іншых працягваюць весці бізнес у краіне. Сярод іх Reuters называе Mondelez International, PepsiCo, Auchan, Nestle, Unilever, Reckitt, British American Tobacco. Акрамя таго, многія вытворцы тавараў паўсядзённага попыту ўстрымліваюцца ад поўнага сыходу, аргументуючы гэта тым, што спажыўцы ў Расіі выкарыстоўваюць іх прадукцыю.



### З Парыжа перад Алімпійскімі гульнямі вывезлі сотні бяздомных і мігрантаў

Сотні мігрантаў і бяздомных былі вывезены з Парыжа ў іншыя рэгіёны Францыі на чартарных аўтобусах. Пра гэта паведаміў Euronews. Адзначаецца, што мінімум 500 мігрантаў і бяздомных пасадзілі ў аўтобусы і вывезлі з французскай сталіцы. Некаторыя няўрадавыя арганізацыі сцвярджаюць, што ўлады праводзяць кампанію, накіраваную на тое, каб зрабіць Парыж «больш прэзентабельным» падчас Алімпійскіх гульняў, якія маюць адбыцца. Урад Францыі сцвярджае: зробленыя крокі былі выкліканы тым, што цэнтры часовага размяшчэння мігрантаў у дадзены момант перапоўнены. Мэры французскіх рэгіёнаў тым часам выказваюць сваё абурэнне наконт зноў прыбылых, адзначае Euronews. Так, мэр Арлеана Серж Груар заявіў, што такія перасяленні выклікаюць трывогу.




ISSN 1990 - 763X

### Кожны дзясяты італьянец жыве ў абсалютнай беднасці

У мінулым годзе кожны дзясяты італьянец жыў у абсалютнай беднасці. Аб гэтым сведчаць даныя Нацыянальнага інстытута статыстыкі (ISTAT), перадае «Сіньхуа». Паводле гэтай інфармацыі, летась 5,75 мільёна італьянцаў жылі ў абсалютнай беднасці, у 2022-м — 5,67 млн і ў 2021-м — 5,32 млн. У мінулым годзе гэтая група складала 9,8 працэнта насельніцтва краіны. Па вызначэнні ISTAT, чалавек, які жыве ў абсалютнай беднасці, — гэта той, хто не мае сродкаў для задавальнення сваіх асноўных патрэб, такіх як ежа і чыстая пітная вада, адзенне, медыцынскае абслугоўванне і жыллё. Паводле звестак ISTAT, самы высокі ўзровень абсалютнай беднасці быў зафіксаваны ў пераважна сельскагаспадарчых паўднёвых рэгіёнах краіны, а самы нізкі — у прамыслова развітых паўночных. Пры гэтым на поўначы назіраецца больш хуткі рост узроўню беднасці ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі.



## АФІЦЫЙНА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указы, у адпаведнасці з якімі шэраг службовых асоб вызвалены ад займаных пасад. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Ігар Сергеенка вызвалены ад пасады кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сувязі з пераходам на выбарную пасаду служачага.

На той жа падставе вызвалены ад пасад міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, памочнік Прэзідэнта — інспектар па г. Мінску Аляксандр Барсукоў, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім Іпатаў, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі Вячаслаў Даніловіч.

Таксама генерал-маёр Генадзь Ляпешка вызвалены ад пасады начальніка ўстановы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь», а генерал-маёр юстыцыі Андрэй Ліс — ад пасады начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Мінскай вобласці. Імі прыпынена, адпаведна, ваенная служба і служба ў Следчым камітэце ў сувязі з выбраннем дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на тэрмін іх паўнамоцтваў.

Мікалай Маратаеў вызвалены ад пасады намесніка старшыні і суддзі Гомельскага абласнога суда ў сувязі з выбраннем на іншую пасаду. Ён таксама выключаны са складу прэзідыума Гомельскага абласнога суда.

Па-за палітыкай

# ДЗВЕ КРАІНЫ — АДЗІН ЛЕС

### Тыя, хто штучна яго падзяляе, не думаюць пра будучыню

**27 сакавіка рэактыўная маніторынгавая місія ЮНЕСКА/МСАП, якая праводзіць ацэнку ўздзеяння загараджальнай пабудовы на беларуска-польскай граніцы, завяршыла сваю работу ў Беларусі. На працягу чатырох дзён міжнародныя эксперты сумесна з прадстаўнікамі Мінпрыроды, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржкантролю, Дзяржпагранкамітэта, ДПУ «Нацыянальны парк «Белавежская пушча», органаў мясцовага самакіравання і грамадскасці даследавалі частку пушчы на тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.**



Як расказаў на выніковай прэс-канферэнцыі **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ**, у студзені 2022 года без правядзення неабходных будаўнічай і экалагічнай экспертызы польскі бок пачаў узвядзенне агароджы, якая праходзіць у тым ліку і па тэрыторыі трансгранічнага аб'екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча». У чэрвені таго ж года аб'ект, які складаецца з бетону, жалеза і калючага дроту, быў завершаны.

На думку беларускіх вучоных, з-за штучнага раздзялення пушчы і ўзведзенага загараджальнага збудавання ўзнікла рэальная пагроза існаванню рэдкіх і асабліва каштоўных прыродных комплексаў. Парушэнне глебавага покрыва прыводзіць да змены ўзроўню грунтавых вод, што, у сваю чаргу, можа прывесці да гібелі разнаўзроставых лясоў, дэградацыі забалочаных тэрыторый і водна-балотных угоддзяў. Блакіраванне сталых міграцыйных калідораў буйных млекакормячых, падзел папуляцый рысі і ваўка негатыўна адбіваюцца на стане біяразнастайнасці рэгіёна. Транспартны трафік, які павялічыўся, служыць патэнцыяльнай пагрозай для распаўсюджвання інвазійных відаў раслін, у першую чаргу гэта сумнік канадскі.

Беларускі бок яшчэ на этапе прыняцця польскім бокам рашэння аб узвядзенні агароджы шматразова звяртаўся ў міжнародныя прыродаахоўныя структуры ААН з патрабаваннем не дапусціць будаўніцтва, якое разбурае экасістэму Белавежскай пушчы. Аднак ніякай рэакцыі не было. І толькі ЮНЕСКА як арганізацыя, якая сапраўды добрасумленна і абсалютна непрадузята выконвае свае функцыі, адрэагавала і ўключыла ў парадак 45-й сесіі Камітэта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА пытанне аб стане трансгранічнага аб'екта «Белавежская пушча».

СТАР. 2

# «Духоўна-маральныя каштоўнасці дапамагаюць ствараць базіс грамадзянскай ідэнтычнасці»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«У выніку ўзнікаюць новыя, невядомыя ў мінулым, праблемы, цяжкасці, супярэчнасці, абумоўленыя гісторыяй і характарыстыкамі сучаснага стану грамадства, унутранымі сацыякультурнымі працэсамі і знешнімі ўздзеяннямі ва ўмовах інфармацыйнай глабалізацыі, адкрытасці адукацыі і культуры», — падсумавала яна. Па словах спікера, заслону пералічаным негатыўным тэндэнцыям у адзіночку паставіць не магчыма. У сувязі з гэтым пытанне пашырэння колькасці ўдзельнікаў працэсу далучэння да духоўна-маральных каштоўнасцяў выходзіць на прыярытэтны ўзровень. Складваецца якасна новая прастора ўзаемадзеяння інстытутаў адукацыі, дзяржавы, сям'і, царквы як структур грамадзянскай супольнасці.Таму, па словах Старшыні Савета Рэспублікі, само месца, у якім праходзіла пасяджэнне Прэзідыума — Свята-Елісавецінскі манастыр — спрыяе адкрытай гутарцы, калектыўнай выпрацоўцы прадукцыйных рашэнняў па гэтай актуальнай тэме. Наталля Качанава падкрэсліла, што дзейнае служэнне насельніц манастыра ў дамах-інтэрнатах, установах аховы здароўя і адукацыі, патранажная служба, дапамога асобам, якія пакутуюць на залежнасці, і многія іншыя дабрачынныя справы манастыра заслугоўваюць вялікай павагі і ўдзячнасці. «Гэта сапраўды паказальны прыклад эфектыўнага грамадска-дзяржаўнага партнёрства», — рэзюмавала спікер. Па словах Наталлі Качанавай, у нашай краіне закладзены трывалыя асновы ўзаемадзеяння Беларускай праваслаўнай царквы і нашых улад, дзяржавы ў цэлым. Гісторыя праваслаўя на беларускіх землях непарыўна звязана з гісторыяй станаўлення нашай дзяржаўнасці. У суверэннай Беларусі пытанню падтрымання рэлігійнага і этнаканфесіянальнага дабрабыту заўсёды ўдзялялася самая сур'ёзная ўвага. Чарговае сведчанне таму — нядаўняя сустрэча кіраўніка дзяржавы з Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы, у ходзе якой абмяркоўвалася ў тым ліку бягучая геапалітычная сітуацыя і падкрэслівалася асаблівая гістарычная місія нашай краіны.



«Відавочна, што ў сучасных рэаліях роля грамадска-дзяржаўнага партнёрства будзе толькі ўзрастаць. Менавіта таму гэта тэма абавязкова ўлічваецца ў прыняцці стратэгічных рашэнняў па развіцці беларускай дзяржавы і грамадства, абнаўленні праграмных і заканадаўчых дакументаў нашай краіны», — заявіла Старшыня Савета Рэспублікі. Яна нагадала, што пры ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю быў зроблены акцэнт на пераемнасці, захаванні самабытнасці беларускага народа, яго спрадвечных духоўна-маральных каштоўнасцяў, якія вызначаны ў прэамбуле. Частка першая артыкула 32 пасля слова «Шлюб» дапоўнена словамі «як саюза мужчыны і жанчыны». У праекце абноўленай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь выдзелена «сацыяльная бяспека як стан абароненасці асобы, грамадства і дзяржавы ад уздзеяння сацыяльных пагроз, што забяспечвае захаванне жыцця, здароўя і дабрабыту грамадзян, духоўна-маральных каштоўнасцяў беларускага народа».

Наталля Качанава падкрэсліла, што ўмацаванне традыцыйных каштоўнасцяў, статусу сям'і заўсёды былі і застаюцца ў ліку ключавых кірункаў заканатворчай дзейнасці Савета Рэспублікі. Зыходзячы ў тым ліку і з гэтых пазіцый, былі прыняты новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі, якая ўзмацняе выхаваўчы кампанент, Закон «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі», змены ў Закон «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», якія пашыраюць магчымасці ўдзелу моладзі ў грамадска значнай дзейнасці. Унесены змяненні ў законы па пытаннях дзейнасці рэлігійных арганізацый. Савет Рэспублікі праводзіць шэраг мерапрыемстваў сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой.

### Патрыятызм — вельмі высокае пачуццё, і яго няпроста выхаваць

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі,** падкрэсліў, што ў сучасным свеце адбываецца сапраўдная духоўная вайна за розумы і сэрцы, якая з кожным годам будзе толькі абвастрацца. «Усё гэта патрабуе, мяркую, ад нас гатоўнасці супрацьстаяць гэтым тэндэнцыям», — падкрэсліў ён.

У сувязі з гэтым мітрапаліт Веніямін зрабіў акцэнт на такой важнай тэме, як выхаванне патрыятызму. «На жаль, тыя каштоўнасці, якімі прасякнута масавая культура і сучасная інфармацыйная прастора, не спрыяюць фарміраванню любові да радзімы ў маладога пакалення. Ды і не толькі ў маладога. Пры гэтым сёння ёсць спакуса фарміравання падманнага патрыятычнага пачуцця, калі любоў да свайго мае на ўвазе не толькі непрыманне чужога, але, больш за тое, — нянавісць да іншага, — падкрэсліў ён. Мітрапаліт Веніямін адзначыў, што патрыятызм — вельмі высокае пачуццё, і яго няпроста выхаваць. Гэта патрабуе многіх намаганняў і часу. «Можна ўводзіць адпаведныя курсы ў школах і ўніверсітэтах, але і гэтага будзе недастаткова, калі ўвесь адукацыйны працэс, усё асяроддзе, у якім выхоўваецца і жыве малады чалавек, не будзе прасякнута правільнымі сэнсамі і добрымі прыкладамі. Сумленнасць, самаахвярнасць, мужнасць, высакароднасць — усе гэтыя каштоўнасці знойдуць жывы водгук у маладой душы, калі яны будуць мець зразумелую і эмацыянальна блізкую для яе форму. У сувязі з гэтым вялікае значэнне мае сфера культуры: і высокай, і масавай. У нас праводзіцца велізарная колькасць выдатных мерапрыемстваў самага球 рознага характару. І важна, каб мы звярталі ўвагу не толькі на навізну, эстэтычны бок той ці іншай культурнай з'явы. Усё, што робіцца ў гэтай галіне, павінна быць прасякнута высокімі маральнымі матывамі», — сказаў ён.



Уладыка звярнуў увагу, што вялікая адказнасць ляжыць і на медыя. Па яго словах, ад таго, якім публікацыям і праграмам аддаецца прыярытэт у СМІ, хто становіцца іх героямі, напрамую залежыць, хто стане для моладзі прыкладам для пераймання, які лад думкі і дзеянняў выбера для сябе чытач і глядач. «Перакананы, аб'яднаўшы намаганні, працуючы сістэмна па ўсіх кірунках, наша грамадства зможа пераадолець нават тыя праблемы, якія фарміраваліся дзесяцігоддзямі і здаваліся невырашальнымі. У першую чаргу гэта датычыцца дэмаграфічнай сітуацыі. Калі нашы дзеці будуць у дзіцячых садках і школах выхоўвацца на добрых прыкладах, калі ў кіно, спектаклях будуць прадстаўлены годныя пераймання прыклады, а ў інфармацыйнай прасторы — дамінаваць культ шматдзетнай шчаслівай сям'і, а не падыходы, якія, на жаль, прабіваюцца да нас звонку, то можна сказаць, што і гэтую праблему мы вырашым», — падсумаваў мітрапаліт Веніямін. Асобна ён адзначыў ролю, якую адыграла правядзенне ініцыіраванага Саветам Рэспублікі форуму «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава», які прайшоў у Сафійскім саборы горада Полацка і намеціў комплекснае вырашэнне гэтай праблемы.

На пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі ад імя духавенства выступіў **мітрапаліт Сімферопальскі і Крымскі Ціхан, старшыня Патрыяршага савета па культуры.** Ён таксама выказаў сваё меркаванне на пытанні духоўна-маральнага выхавання грамадства. Па яго словах, важна будаваць гэту работу так, каб у людзей не было адпрэчвання. Таму гэтыя пытанні архіважныя і датычыцца кожнага, хто працуе з людзьмі.

**Міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** у сваім дакладзе адзначыў, што страшныя духоўныя пагрозы, якія дзейнічаюць падобна радыяцыі, — быццам незаўважна, але павольна і дакладна разбураюць грамадства, вядуць да страт маральных арыенціраў і маральнай дэградацыі людзей. Каб эфектыўна супрацьстаяць гэтым пагрозам, трэба перш за ўсё атрымаць маральную перамогу, загартаваць свой дух, каб захаваць сябе і сваю краіну. І адным з важных складнікаў патрыятызму з'яўляецца любоў да бліжняга, да сям'і, старых і дзяцей, павага да нацыянальнай гісторыі і мовы, прытрымліванне традыцый народа. На жаль, некаторы час назад гэтыя вечныя паняцці аказаліся адсунутыя на другі план у культуры як несучасныя. Але сітуацыя выпраўляецца. «У першую чаргу змены закранулі дзейнасць аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны і музеяў. Тут у рабоце з моладдзю ажыццяўляецца канцэпцыя работы з жывой гісторыяй, заснаваная на паглыбленні ў гістарычнае асяроддзе. Мы разбурылі стэрэатып аб тым, што беларусы на працягу стагоддзяў былі шэрым, лапцёжным народам, і ўзмацнілі ў моладзі пачуццё гонару за сваю краіну. Школьнікам дадзена права адзін раз на месяц бясплатна наведваць любыя музеі краіны. З лютага гэтага года сумесна з Міністэрствам адукацыі мы рэалізоўваем праект «Урокі ў музеях», — распавёў міністр.

### Традыцыйныя і новыя сродкі камунікацыі — важна ўсё

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ**, абмяркоўваючы тэму пасяджэння з журналістамі, заўважыў, што моладзь — спецыфічная аўдыторыя, поўная энергіі. «Часта маладыя людзі спрабуюць адмаўляць тое, што гавораць ім старэйшыя, канфлікт бацькоў і дзяцей. Пры гэтым, як губка, убіраюць інфармацыю. Таму мы выкарыстоўваем такія метады як камунікат вочы ў вочы ў рамках сустрэч, круглых сталоў, брыфінгаў, у нефармальнай абстаноўцы — на экскурсіях. Не варта скідаць з рахункаў новыя сродкі камунікацыі — гэта групы ў месенджарах, супольнасцях, сацыяльных сетках. Ну і, вядома, кнігі, да якіх у моладзі вяртаецца цікавасць. Прычым кнігі не толькі забаўляльнага характару, але і non-fiction літаратура. Пасля нашай выстаўкі (Мінскай міжнароднай выстаўкі-кірмашу, якая праходзіла нядаўна. — «Зв.»), мы зрабілі выснову, што беларуская моладзь набывае кнігі, чытае. Прычым не толькі кнігі ў мяккай вокладцы, якія зручна браць з сабой, але і калекцыйныя выданні. Паколькі ўжо няма цалкам даверу тым крыніцам інфармацыі, якія яшчэ ўчора лічыліся кананічнымі», — адзначыў міністр.

**Старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ** падкрэсліў, што духоўна-маральнае выхаванне грамадства і асобна ўзятых сацыяльных груп, асабліва моладзі — гэта задача грамадства і дзяржавы ў цэлым. Тут не можа быць ніякай раз'яднанасці, ніякага сепаратызму. «Зразумела, у такой сітуацыі мы гаворым аб адукацыі, аб сям'і. Але сёння колькасць тых, хто можа ўплываць на розум людзей, значна большая. Гэта палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, дзяржава ў асобе сваіх інстытутаў, якія фарміруюць палітычную культуру людзей. Важна, каб намаганні былі аб'яднаны разам. У такім выпадку мы будзем мець цэласны светапогляд грамадзян, атрымаем чалавека, у якога ўсе грані душы знаходзяцца ў гармоніі. Гэта прынцыпова важная задача для любога грамадства, каб была высокая якасць асобы, высокі ўзровень выхавання чалавека», — канстатаваў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**



# ДЗВЕ КРАІНЫ — АДЗІН ЛЕС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Дзякуючы гэтаму, у рамках выканання рашэння 45COM 7B.21, прынятага ў верасні 2023 года, была арганізавана цяперашняя маніторынгавая місія.

Кіраўнік аддзела прыроднай спадчыны Цэнтра сусветнай спадчыны ЮНЕСКА і супрацоўнік Міжнароднага саюза аховы прыроды (МСАП) вывучылі ўплыў загараджальнай пабудовы на цэласнасць асаблівай ахоўнай прыроднай тэрыторыі — Белавежскай пушчы, яе экалагічныя функцыі, а таксама магчымасці перамяшчэння дзікіх жывёл. Таксама ў рамках работы місіі былі праведзены сустрэчы, дзе ўдзельнікі выказалі сваё бачанне праблемы, абмяняліся думкамі. Аднадушна было адзначана, што негатыўнае ўздзеянне на экасістэмы Белавежскай пушчы ўжо праяўляецца і з часам сітуацыя будзе толькі пагаршацца. У сваю чаргу міжнародныя эксперты пасля падрыхтоўкі справаздачы аб правядзенні рэактыўнай маніторынгавай місіі дадуць яе на азнаямленне беларускаму боку. А выніکі будуць разгледжаны падчас 46-й сесіі Камітэта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, якая пройдзе з 21 да 31 ліпеня бягучага года ў Дэлі (Рэспубліка Індыя).

Намаганні беларускага боку па захаванні каштоўнасці Белавежскай пушчы, паводле слоў **начальніка галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды Таццяны КАНАНЧУК**, не раз былі высока ацэнены міжнароднымі арганізацыямі. У той жа час яшчэ ў 2018 годзе Камітэтам сусветнай спадчыны ЮНЕСКА беларускаму і польскаму бакам было рэкамендавана ўзмацніць узаемадзеянне па ахове адзінага аб'екта і прыняць сумесны план кіравання. Нягледзячы на неаднаразовыя спробы Мінпрыроды запрасіць польскі бок да распрацоўкі дадзенага дакумента, адказ да гэтага часу так і не паступіў. Таксама падчас падрыхтоўкі місіі Камітэт ЮНЕСКА прасіў Польшчу і Беларусь да 1 лютага 2024-га падаць сумесную справаздачу аб стане захаванасці аб'екта. Аднак з-за адмовы польскім бокам ад сумеснай дзейнасці справаздачы кожная краіна прадставіла паасобку.

Як адзначыла спецыяліст Мінпрыроды, міжнародныя эксперты разумеюць, што пакуль няма дыялогу паміж краінамі, у адзіночку беларускі бок не зможа забяспечыць захаванасць пушчы і яе ўнікальныя каштоўнасці. Але захоўваецца надзея, што ЮНЕСКА ўсё ж зможа выступіць пасрэднікам і пасадзейнічае аднаўленню міждзяржаўных кантактаў і сумеснай рабоце.



Завяршаючы прэс-канферэнцыю, Аляксандр Корбут канстатаваў, што цяпер мы стаім перад небяспекай знішчэння цэласнасці экасістэм Белавежскай пушчы. А прымаючы да ўвагі ўзаемасувязь усіх кампанентаў навакольнага асяроддзя і трансгранічны характар тэрыторыі, гэта можа ўяўляць пагрозу для экасістэм усяго еўрапейскага рэгіёна. Таму так важна даводзіць праўдзівую інфармацыю аб тым, што адбываецца, да ўсіх зацікаўленых бакоў. Мінпрыроды ў рабоце з ЮНЕСКА будзе кіравацца двума прынцыпамі: дзве краіны — адзін лес і навука і прырода — па-за палітыкай!

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ,**
**фота аўтара.**

Тры пытанні да ўлады

# Пра пасяўную, заработную плату і... космас

## Гутарка са старшынёй Брэсцкага райвыканкама

**Раёны пры вялікіх гарадах заўсёды маюць свае асаблівасці, горад аказвае ўплыў на іх развіццё, пры гэтым раён не мае ўласнага райцэнтра. У нашым выпадку эканоміка раёна дэманструе ўстойлівы рост, што важна, колькасць насельніцтва не памяншаецца. Чым яшчэ адметны Брэсцкі раён — аб гэтым наша сённяшняя гутарка са старшынёй райвыканкама Уладзімірам СЕНЧУКОМ.**



***— Зараз ва ўсіх раёнах пытанне нумар адзін — сяўба. А летась, як вядома, Брэсцкі раён вызначыўся асаблівымі поспехамі ў галіне раслінаводства і быў заслужана ўганараваны на абласных «Дажынках». Утрымаць высокую планку, вядома, няпроста. Падмуркам жа багатага ўраджаю з'яўляецца паспяхова праведзеная сяўба. Чым вызначаецца сёлетняя пасяўная кампанія?***

— Так, летась упершыню ў гісторыі раёна ўзяты рубеж па намалоце каласавых і зернебабовых культур у 100 тысяч тон. Мы атрымалі 106,3 тысячы тон пры ўраджайнасці 53,6 цэнтнера з гектара. Сёлета плануем атрымаць звыш 107 тысяч тон збожжа, 11 тысяч тон агародніны, 82 тысячы тон цукровых буракоў, 17 тысяч тон масланасення рапсу і шмат іншай прадукцыі. Паспяхова праведзена сяўба азімых, унесена дастаткова мінеральных угнаенняў, праведзена асенняя хімпраполка.

З пачатку мінулага тыдня ўсе гаспадаркі прыступілі да сяўбы ранніх яравых культур. Усяго гэтай вясной будзе засеяна 21 046 гектараў, у тым ліку яравых збожжавых і зернебабовых на плошчы 8426 гектараў. Адначасова вядзецца падкормка азімых культур, шматгадовых траў. Работа ідзе ў штатным рэжыме. Віды на ўраджай добрыя.

***— У адрозненне ад іншых сельскіх раёнаў колькасць насельніцтва ў Брэсцкім не скарачаецца, а расце. За кошт чаго? Як спраўляюцца камунальныя і іншыя службы з павелічэннем колькасці жыхароў у летні перыяд?***

— Узровень колькасці насельніцтва нашага раёна ў апошнія гады захоўвае станоўчую дынаміку. У працэнтных адносінах рост невялікі, але ён ёсць з году ў год. Пры гэтым адчувальным з'яўляецца рост насельніцтва працаздольнага ўзросту і дзяцей. Гэта вынік уплыву фактараў, якія паляпшаюць умовы жыцця. Маецца на ўвазе дастойная аплата працы, фінансавая і матэрыяльная падтрымка на дзяржаўным узроўні. Варта сказаць, што сярод раёнаў Брэсцкай вобласці (акрамя гарадоў) па сярэднім узроўні заработнай платы Брэсцкі знаходзіцца на першай пазіцыі.

Важным паказчыкам стану эканомікі і дабрабыту людзей з'яўляецца павелічэнне колькасці шматдзетных сем'яў. Па стане на пачатак года ў раёне зарэгістравана 1195 шматдзетных сем'яў, у якіх выхоўваюцца 4102 дзіцяці. З 2020 года колькасць такіх сем'яў узрасла на 172. Асноўным крытэрыем росту дэмаграфічнага паказчыка з'яўляецца актыўнае будаўніцтва жылля для шматдзетных сем'яў. Дзякуючы фінансавай падтрымцы дзяржавы ў частцы льготнага крэдытавання, датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу інтэнсіўна забудоўваецца прыватны сектар.

Яшчэ адна асаблівасць абумоўлена тым, што на тэрыторыі Брэсцкага раёна размяшчаецца 250 дачных таварыстваў абласнога цэнтра. Летам насельніцтва раёна павялічваецца, можна сказаць, удвая. Дадатковую нагрузку нясуць службы ЖКГ, гандаль, праваахоўныя органы. Але працэс адпрацаваны гадамі, пытанні, якія ўзнікаюць, вырашаюцца ў рабочым парадку.

***— Як вядома, патрыятычнае выхаванне маладога пакалення грунтуецца найперш на любові да малой радзімы. У Брэсцкім раёне ёсць населеныя пункты, з якіх можна пісаць цэлыя раздзелы па гісторыі краіны. На слыху, напрыклад, Дамачава, дзе асабліва крывавы след пакінула вайна. Астрамечава вядомае багатай гісторыяй, населены пункт нярэдка называюць культурнай сталіцай раёна. Тамашоўка прыцягвае ўвагу музеем касманаўтыкі...***

— Гэты спіс можна пашыраць і працягваць. І пачаў бы я з унікальнага музея баявой і працоўнай славы, які размешчаны ў сярэдняй школе пасёлка Мухавец. Музей слаўны не толькі каштоўнымі матэрыяламі, але і яго захавальнікамі. Стваральніца экспазіцыі Таццяна Басацкая, нястомная руплівіца гісторыі, разам з калегамі і школьнікамі праводзіла вялікую пошукавую работу. Дзякуючы яе намаганням у 70-я гады з'явіліся памятныя знакі ва ўрочышчы Плянта, у вёсках Камяніца Жыравецкая, Падлессе Радваніцкае, Падлессе Камянецкае, помнік у Мухаўцы і іншыя. У 90-я гады эстафету падхапіла Юлія Барысюк, музей паспяхова працягвае пошукавую, выхаваўчую работу.

Памяць пра трагедыю Дамачаўскага дзіцячага дома, пра 53 расстраляных яго выхаванцаў разам з юнай выхавальніцай падтрымлівае Дамачаўская сярэдняя школа. Кожны год там праводзяцца мітынгі, іншыя памятныя мерапрыемствы. Крыху больш за год таму школа і Белтэлерадыёкампанія прадставілі сумесны праект — дакументальны фільм «Расстралянае дзяцінства». Памяць пра вайну, захаванне гістарычнай праўды — важнейшы кірунак у справе патрыятычнага выхавання моладзі.

Яшчэ адзін вялікі пласт работы — захаванне гістарычнай спадчыны. Сапраўды, нездарма Астрамечава называюць культурнай сталіцай раёна. Тут на кожным кроку сустрэнеш дыханне гісторыі: язычніцкі каменны ідал, курганы II—III стагоддзяў, радавое гняздо Казіміра Лышчынскага, Пакроўская царква, узведзеная ў 1742 годзе. Восенню 1905 года асветнікам і кнігавыдаўцом Фларэнціем Паўлянковым была адкрытая адна з першых на Беларусі народных бібліятэк. Налета будзем адзначаць 120-годдзе Астрамечаўскай бібліятэкі. Астрамечаўскі дом культуры вядомы сваімі творчымі калектывамі, адзінаццаць з іх маюць званне «народнага». У вёсцы працуе Дом рамёстваў. А ў 2013 годзе пачаў выдавацца альманах «Астрамечаўскі рукапіс» у памяць пра аднайменны рукапісны зборнік нот старадаўняй беларускай музыкі XVI—XVII стагоддзяў. Альманах выходзіць пры поўнай фінансавай падтрымцы Брэсцкага райвыканкама ў выглядзе каляровага ілюстраванага выдання на беларускай і рускай мовах і сёння па праве лічыцца культурным брэндам раёна.

Ну а Тамашоўка з адзіным у нашай краіне музеем касманаўтыкі перажывае цяпер асаблівы ўсплёск інтарэсу. Музей размешчаны ў школе, якую скончыў першы касманаўт, ураджэнец Беларусі, двойчы Герой Савецкага Саюза Пётр Клімук. Для наведвальнікаў музей расчыніў свае дзверы ў 1978 годзе, дваццаць гадоў таму адбылася яго рэканструкцыя. Экспазіцыю наведала ўжо каля мільёна чалавек з Беларусі і іншых краін свету. Музей мае трывалыя сувязі з цэнтрам «Байканур», музеем Цыялкоўскага, «Зорным гарадком». Нярэдкі госць у школе наш слынны зямляк Пётр Ільіч Клімук, які паспрыяў таму, каб экспазіцыя мела ўнікальныя экспанаты. Названы музей даўно стаў цэнтрам патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання школьнікаў. А цяпер, калі на арбіце знаходзіцца першая касманаўтка нашай незалежнай краіны, музей набывае яшчэ большую актуальнасць і значнасць, ён становіцца месцам летапісу касмічнай гісторыі нашай краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### Организатор аукциона – Червенский районный исполнительный комитет

| № лота | Сведения о виде и предмете аукциона | Адрес объекта и его наименование | Срок аренды | Начальная цена объекта (рублей) | Сумма задатка (рублей) | Расходы по организации и проведению аукциона (рублей) | Ограничения (обременения) прав в использовании земель и другие ограничения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аукцион на право аренды земельных участков | Земельный участок для строительства и обслуживания объекта производственно-складского назначения, расположенного по адресу: Минская область, Червенский район, Валевачский с/с, 13, вблизи д. Залесье, площадь – 1,0254 га, кадастровый номер 625880800001001203 | 99 лет | 4145,18 | 414,52 | 4289,55 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничение (обременение) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоёмов – 1,0254 га, в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог – 0,999 га |

Аукцион состоится **26 апреля 2024 года в 11.00** в здании Червенского райисполкома (зал заседаний) по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в указанный срок подает: заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона; документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию представляются документы в соответствии с п. 11 Положения о порядке организации и проведения аукционов на право аренды земельных участков, п. 13 Положения о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность гражданам, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13.01.2023 года № 32.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующие заявления с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1, райисполком, кабинет 69, тел. 80171428491 **по 25 апреля 2024 года включительно.**

**Сумма задатка в размере 10 %** от начальной цены земельного участка перечисляется на расчетный счет BY94AKBB36410627000026000000 в ЦБУ 627 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 600008398. Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников. При наличии единственного участника, аукцион признается не состоявшимся.

Единственный участник несостоявшегося аукциона в праве приобрести земельный участок за начальную цену с учетом 5 % к начальной цене этого земельного участка.

*Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета www.minsk-region.gov.by.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже недвижимого имущества ОАО «Витязь»

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00042** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу https://etpvit.by/.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 26-55-08.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 30.04.2024 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Нежилое помещение с кадастровым номером 77:09:0003013:2630 площадью 48,5 кв. м, назначение – нежилое помещение, по адресу: Российская Федерация, г. Москва, вн.тер.г. муниципальный округ Войковский, шоссе Ленинградское, дом 8, корпус 2, помещение 12П, расположено в подвале жилого дома.

**Нач. цена: 375 000,00** бел. руб. без учета НДС. Задаток: 37 500,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 29.04.2024 по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY.**

**Сумма задатка перечисляется Оператору электронных торгов, получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга»: в белорусских рублях**: р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, IBAN MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901; **в российских рублях**: ЗАО «МТБанк» JSC «MTBank»,SWIFT:MTBKBY22,address:6-a,Partizansky Av., 220033 Minsk,Republic of Belarus, Номер счета/Correspondent Account: 30111810300002054666 в RUB/ Банк-корреспондент/Correspondent bank: КБ «Москоммерцбанк» (АО)Россия, 119017, Москва, ул. М. Ордынка, д. 20, стр. 1, БИК 044525951, корсчет: 30101810045250000951 в ГУ Банка России по Центральному федеральному округу г. Москва, для зачисления на счет BY48MTBK30120001064300050439 для ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения эл. торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение независимой оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи; в случае недостижения согласия между Продавцом и Покупателем по срокам оплаты предмета эл. торгов, предмет эл. торгов оплачивается в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. НДС от цены продажи предмета эл. торгов уплачивается сверх стоимости предмета эл. торгов. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за день до наступления даты их проведения.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 212-265383.

белагропромбанк
традиции будущего

## Вниманию акционеров открытого акционерного общества «Белагропромбанк»

*Место нахождения общества: г. Минск, проспект Жукова, 3.*

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – банк) сообщает, что согласно решению годового общего собрания акционеров банка от 22 марта 2024 года, протокол № 1, с 20 мая 2024 года, если иное не предусмотрено законодательством, банком будет осуществляться выплата дивидендов по итогам работы за 2023 год по привилегированным акциям из расчета 0,03 рубля на одну акцию, по простым (обыкновенным) акциям из расчета 0,00465 рубля на одну акцию.

Список акционеров банка, имеющих право на получение дивидендов, сформирован на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 16 февраля 2024 года.

Выплата дивидендов акционерам банка осуществляется:

- юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям в безналичном порядке в соответствии с законодательством;
- физическим лицам в безналичном порядке в соответствии с законодательством либо в установленном порядке наличными денежными средствами в банке.

**Дополнительную информацию можно получить по телефону (8017) 229 64 10**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 2 от 17 января 2024 г. УНП 100693551.*

## Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»

*(Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49)*

| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | ЛОТ 1: капитальное строение, инвентарный № 412/С-87273 (целевое назначение – здание специализированное коммунального хозяйства 2 29 16, наименование – здание центральной котельной), общей площадью 134,0 кв. м), расположенное по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, аг. Хартица, ул. Ленина, 16Г. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 424081702101000578 площадью 0,0323 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания центральной котельной), расположенном по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, аг. Хартица, ул. Ленина, 16Г. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2,4, площадь – 0,0323 га. Условия аукциона: - оплата за капитальное строение должна быть внесена в течение 90 (девяносто) календарных дней с даты заключения договора; - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору; - переход права собственности и передачи капитального строения осуществляется после государственной регистрации сделки; - расходы по удостоверению договора купли-продажи капитального строения в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» несет покупатель; - обязанности подписания и подачи в РУП «Гродненское агентство по государственной регистраций и земельному кадастру» заявление о государственной регистраций и документов, необходимых для осуществления государственной регистраций договора купли-продажи, и основанного на нем права собственности на капитальное строение возлагается на покупателя; - по соглашению сторон отчуждаемое капитальное строение до полного расчета будет находится в залоге ОАО «Агрокомбинат «Скидельский. Обременений со стороны третьих лиц не имеет |
| Начальная цена продажи | 4 800 руб. (четыре тысячи восемьсот рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 480 руб. (четыреста восемьдесят рублей) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 11.04.2024 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 06.10.2023 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества **ОАО «МТЗ»** (Продавец)

Аукцион состоится **29.04.2024 в 14.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1** в составе:

1. Здание карантинника на 300 голов, 407,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149390, инв. № 100403.
2. Механизированное зернохранилище емкостью 1000 т, 714,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149386, инв. № 100365.
3. Убойный пункт свинотоварной фермы на 1000 голов, инв. № 100341, 143,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149316, инв. № 100341.
4. Дезбарьер, площадь застройки 77,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149320, инв. № 104596.
5. Канализация бытовая, 285,0 м: № по ЕГРНИ 600/С-149330, инв. № 104590; инв. № 104589.
6. Здание свинарника-откормочника на 1000 голов, 1604,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149327, инв. № 100404.
7. Весовая, 87,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149391, инв. № 100342.
8. Хранилище для картофеля, овощей и фруктов, 663,8 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149387, инв. № 100364; инв. № 100561; инв. № 104594.
9. Водопровод пожарно-питьевой, 1573,8 м: № по ЕГРНИ 600/С-149389, инв. № 104591.
10. Здание свинарника для откорма на 1000 голов, 2591,1 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149331, инв. № 100339; инв. № 101594; инв. № 101743; инв. № 101740; инв. № 104593; инв. № 211241.
11. Трансформаторная подстанция свинотоварной фермы, 45,6 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149338, инв. № 100340; инв. № 185127; инв. № 185021; инв. № 185022;
12. Сборно-разборное здание арочник, 972,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149388, инв. № 100333.
13. Мастерская ремонтно-технической базы до 40 тракторов, 379,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149326, инв. № 100363.
14. **Движимое имущество:**
- камера холодильная, инв. № 175345;
- резервуар Р-5066, инв. № 114096;
- резервуар Р-5066, инв. № 114097;
- трансформатор ТМ-250/10-83У1-10/0,4, инв. № 113324;
- трансформатор ТМ-2501-10-83У1-10/0,4, инв. № 113325;
- весы автомобильные 500-2РС-30Ц, инв. № 119734;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126556;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126557;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126558;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126559;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126560.

**Адрес Лота:** Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 15/17; 15/21; 15/24; 15/23; около д. Обчак; 15/18; 15/25; 15/20; 15/19; 15/26; 15/22; 15/27, район д. Обчак.

Земельный участок 623684100001000288, 7,3507 га.

Право постоянного пользования.

**Начальная цена** с НДС 20 % – 3 962 521,33 руб.

**Задаток** – 500 000,00 руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG». Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 25.04.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**

## Слонимскому городскому унитарному предприятию жилищно-коммунального хозяйства

**Аукцион состоится 30.04.2024 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лоты | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | **Лот № 1:** трактор (бульдозер) Б10М.1111-1Е, 2004 г. в., заводской номер 34322(152520), инвентарный номер 907507 |
| | **Лот № 2**: автомобиль GAZ-53 19K0 50351, 1990 г. в., гос. № АЕ 6725-4, заводской номер XTH531900L1274632 |
| Начальная цена продажи | **ЛОТ № 1** – 35 160 руб. (тридцать пять тысяч сто шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| | **ЛОТ № 2** – 9 720 руб. (девять тысяч семьсот двадцать рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | **ЛОТ № 1 –** 3 516 руб. (три тысячи пятьсот шестнадцать рублей) |
| | **ЛОТ № 2** – 972 руб. (девятьсот семьдесят два рубля) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 26.04.2024 г. до 15.00 |

Условия проведения аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта;
- возмещение покупателем затрат предприятия на оценку движимого имущества в сумме 208,15 рубля по лоту, выставляемому на торги;
- срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола аукциона.

Обременений со стороны 3 лиц нет

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| Продавец | ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by |

| Предмет электронных торгов: имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, 172 | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|
| **1. Здание банка** (здание нежилое) общей площадью 2124,2 кв. м, инвентарный номер 710/С-52251. Составные части и принадлежности: подвал. **2. Помещение гаражей** (помещение гаражей), общей площадью 41,6 кв. м, инвентарный номер 710/D-54201. **3. Складское помещение** (складское помещение), общей площадью 41,3 кв. м, инвентарный номер 710/D-54202 | **2 425 080,00** |

**Дополнительная информация по лоту:** при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона на сумму **89 437,70 бел. руб. с НДС 20 %.**
Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 741000000006001659:** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания Первомайского отделения ОАО «Белпромстройбанк» в г. Бобруйске общей площадью 0,2969 га

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов. **Условия оплаты предмета электронных торгов:** не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.** Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,5 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Дата и время начала и окончания электронных торгов | Начало торгов: 10.00 **30.04.2024 г.** Окончание торгов: 12.00 **30.04.2024 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| Дата и время окончания приема заявок | Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 29.04.2024 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| Контактные данные | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (продавец) **отменяет аукционные торги**, назначенные на 09.04.2024 г., информация о торгах была опубликована в газете «Звязда» от 27.03.2024 г. № 61 (30195).

УНП 400071204

В газете «Звязда» № 52 (30186) от 14.03.2024 (стр. 15) ООО «Фрондера» было опубликовано извещение о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН», назначенного на 17 апреля 2024 года в 12.00. Торги по лоту № 12 (Компрессорная установка СБ4-С-100.АВ510, инв. № 498) **отменены** по решению продавца.

УНП 100062465

## Закрытое акционерное общество «На Уманской»,

расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 55,

**СООБЩАЕТ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ПО АКЦИЯМ:**

| | |
|---|---|
| Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям | 29.03.2024 г. |
| Дивиденды, начисленные на одну акцию по результатам работы за 2023 г. | 6 руб. 29 коп. на 1 простую акцию |
| Срок и порядок выплаты дивидендов по акциям по результатам работы за 2023 г. | Не позднее 30.04.2024 г. Перечислены одновременно всем акционерам – владельцам простых акций, пропорционально количеству принадлежащих им акций |

УНП 101085067

***Общее собрание акционеров***

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Виктория-Агро» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

**Лот № 1: бригадный дом, инв. № 644/С-61026 общей площадью 97,4 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000010 площадью 0,0417 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 8, р-н д. Салогощ.**
*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0044 га.*
Начальная цена с НДС (20 %) **– 7 500,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **750,00** бел. руб.

**Лот № 2: склад для хранения грубых кормов, инв. № 644/С-61030 общей площадью 1585 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000015 площадью 0,4510 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 12, р-н д. Салогощ.**
*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0478 га.*
Начальная цена с НДС (20 %) **– 45 960,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 596,00** бел. руб.

**Лот № 3: весовая** *(составные части и принадлежности: навес)*, **инв. № 644/С-61032 общей площадью 6,9 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000016 площадью 0,0379 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 14, р-н д. Салогощ.**
Начальная цена с НДС (20 %) **– 9 180,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **918,00** бел. руб.
*Цена снижена на 50 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в следующем размере: по лотам №№ 1, 3 – 10 (десяти) процентов, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 08.06.2022, 02.09.2022, 13.06.2023, 01.11.2023.

Аукцион состоится **15.04.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.04.2024** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: 8 (029) 766-51-01.**

УНП 600072178

Вернісаж

# ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

**Беларускі саюз мастакоў да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў распачаў маштабны праект «Колеры Вялікай Перамогі». Ён дасць магчымасць кожнаму, хто туды завітае, убачыць жывапіс, графіку, скульптуру, замалёўкі з фронту ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама работы вядомых беларускіх мастакоў з фондаў творчай супольнасці і маладых яе аўтараў. Напярэдадні адкрыцця выстаўкі арганізатары і ўдзельнікі расказалі журналістам пра тое, што ўбачаць наведвальнікі Палаца мастацтва, і на якіх яшчэ лакацыях варта чакаць сёлета новыя праекты.**


Фота з сацсетак БСМ.

— Гэты год у нас вельмі насычаны і адказны. Акрамя раённых і рэспубліканскіх праектаў, намі запланаваны і шэраг абласных мерапрыемстваў. Першы праект — «Колеры Вялікай Перамогі», які мы прэзентуем цяпер, стартуе ў Палацы мастацтва і на працягу ўсяго года будзе там дзейнічаць. Ён прымеркаваны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта будзе зменная экспазіцыя з рознымі тэмамі, — адзначыў **старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб ОТЧЫК**. — Яшчэ ў нашых планах вялікі рэспубліканскі праект, які будзе рэалізаваны не з фондаў нашай калекцыі, а з удзелам сучасных аўтараў. Ён пройдзе ў нас у чэрвені-ліпені бягучага года. І рэгулярны графічны пленэр, які мы праводзім на базе мемарыяльнага комплексу «Хатынь», таксама набірае абароты. Летась адзін з мастакоў нашага саюза Усевалад Швайба, які ўдзельнічаў у ім, узяў дзве ўзнагароды: у галіне патрыятычнага выхавання і Нацыянальную прэмію ў намінацыі «Графіка». Яшчэ ў нас сумесна з саюзам дызайнераў рэалізавана экспазіцыя ў Мемарыяльным комплексе «Азарычы». І там плануецца шырокамаштабная выстаўка з удзелам нашай гомельскай арганізацыі, з дарэннем работ музею. Ёсць у планах правесці некалькі пленэраў у Мемарыяльных комплексах «Ала» і «Чырвоны Бераг». У апошнім — плануецца рэнавацыя музейнага комплексу «Дзецям — ахвярам вайны».

Варта адзначыць, што падзеі Вялікай Айчыннай вайны заўсёды былі і застаюцца адной з важнейшых тэм для беларускіх мастакоў розных пакаленняў. І першы праект «Памяці вогненных вёсак» паказвае графічныя работы на тэму вайны народных мастакоў Беларусі Васіля Шаранговіча, Георгія Паплаўскага, Арлена Кашкурэвіча, а таксама работы шэрагу вядомых аўтараў, сярод якіх Павел Любамудраў, Мікалай Селяшчук, Рыгор Віткоўскі і іншыя. У рабоце кожнага з іх аўдыторыя адшукае палітру эмоцый, дзе і боль, і гнеў, і захапленне мужнасцю людзей, і радасць ад Перамогі.

— Падрыхтоўваючы цяперашнюю выстаўку «Колеры Вялікай Перамогі», мы палічылі, колькі мастакоў нашага саюза былі ветэранамі вайны. Выявілася, што 143 чалавекі ўдзельнічалі ў баях. Не ўсе з іх засталіся жывымі, а хто застаўся — гэта вядомыя мастакі. Мы ўсе помнім, што апошні ветэран Леанід Дзмітрыевіч Шчамялёў сышоў ад нас літаральна некалькі гадоў таму. І мы хочам аддаць даніну тым людзям, якія паклалі сябе на алтар Вялікай Перамогі і вялікага мастацтва. Яны вялікай прафесійнай мовай гаварылі на вельмі важную тэму, — зазначыла **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ**. — «Колеры Вялікай Перамогі» будуць паказваць работы знакамітых мастакоў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, дзяцей вайны, прадстаўнікоў больш маладога пакалення на ваенную тэму. У асноўным прадставім работы з фондаў Беларускага саюза мастакоў, яны фарміраваліся якраз у пасляваенны перыяд. Першыя работы на гэтую тэму з'явіліся ў фондах нашага саюза ў 1949 годзе. Мы маем работы 50—60-х гадоў — класічныя, вельмі вядомых мастакоў. І хочацца, каб з запаснікаў саюза яны выйшлі, убачылі свет і знайшлі свайго гледача.

Праект пачалі з графікі яшчэ і з прычыны таго, што адначасова ў Палацы мастацтва будзе адкрывацца вялікі графічны праект, прысвечаны міфалогіі і Бібліі. Арганізатары імкнуліся выбудаваць экспазіцыю так, каб гэтая тэма і работы мастакоў, якія распавядаюць пра трагедыю вайны, пра трагедыю Хатыні, і разам з тым расповед пра тое, што жыццё працягваецца, гучалі ва ўнісон. А далей будуць экспазіцыі жывапісу, скульптуры... Мяняць экспазіцыю плануюць праз кожныя паўтара месяца. Аднак, па меркаванні прадстаўнікоў Саюза мастакоў, самым яркім пунктам праектнай дзейнасці ўсё ж будзе выстаўка, прымеркаваная да 3 ліпеня. Адкрыецца яна ў другой палове чэрвеня і размесціцца ва ўсіх залах Палаца мастацтваў. Там плануюць паказаць работы розных секцый і арганізацый Беларускага саюза мастакоў.

— Прынцыпова важна паказаць і сённяшніх творцаў, як яны мысляць, як адчуваюць тэму вайны. І я разумею, наколькі гэта важная і складаная задача. Таму што ветэрану ці чалавеку, які перажыў нават маленькім жахі вайны, было прасцей выказацца. Маладому мастаку значна складаней. Аднак трансфармацыя мастацкай мовы, асэнсаванне вайны маладымі, мабыць, будуць цікавыя гледачу. Акрамя гэтага, я хачу падкрэсліць, што галоўнай тэмай нашай экспазіцыі, якая адкрыецца напярэдадні 3 ліпеня, будзе тэма Маці. Мы пагаворым пра трагедыю жанчын, маці, якія адправілі на вайну сваіх дзяцей, бо заўсёды ў беларускім мастацтве галоўны — чалавек. Гэта і стане нашым укладам у творчае асэнсаванне тэмы 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — адзначыла Наталля Шаранговіч.

У сваю чаргу, **старшыня секцыі «Традыцыя» БСМ Уладзімір УРОДНІЧ** не толькі расказаў пра найбліжэйшыя праекты, але і падзяліўся сваімі думкамі адносна працэсаў, якімі цяпер характарызуецца беларускае выяўленчае мастацтва:

— На нядаўнім з'ездзе саюза мастакоў мы гаварылі пра тое, што галоўнай тэмай бліжэйшых перыядаў нашага жыцця застанецца ваенна-патрыятычная. І магчыма, многім давядзецца яе культываваць. А гэта даволі доўгі працэс, паколькі ў свеце ідзе жудаснае супрацьстаянне ў барацьбе за праўду, да якога маюць дачыненне і наша краіна, і расіяне. Таму і ў мастацтве як у нас, так і ў нашых суседзяў гучыць пытанне, якая тэма цяпер найбольш важная. Акрамя ваенна-патрыятычнай цяжка прыдумаць нейкую іншую. Але ёсць пытанне: ці знаходзім мы новыя падыходы да творчага развіцця таго, чым займаемся? Калі мы гаворым пра мастацтва, то гаварыць павінны і пра навацыю. А навацыя — гэта неардынарнае мысленне, да гэтага трэба быць гатовым. І грамадства павінна быць гатовым да таго, каб успрымаць некаторыя навацыі творцаў, — дзеліцца Уладзімір Уродніч. — Сёння мы павінны працягнуць ваенна-патрыятычную тэму нашых папярэднікаў. Аднак, падкрэсліваю, трэба знаходзіць свой почырк. Што датычыцца праектаў секцыі «Традыцыя», то ў красавіку напярэдадні Дня Перамогі мы рыхтуем у Жодзіне выстаўку «Шчымлівая мелодыя памяці».

Прыемнай навіной падзяліўся і **старшыня студыі ваенных мастакоў Мікалай АПІЁК**, паведаміўшы, што сёлета яны атрымалі прапанову выставіцца ў красавіку ў Нацыянальным мастацкім музеі. Студыя адзначыла летась сваё 20-годдзе з дня існавання. Гэтую дату святкавалі шэрагам выставак напярэдадні юбілею: у магілёўскім музеі імя Масленікава было прадстаўлена 48 работ, у тым ліку і абласных мастакоў, і выстаўка ў Брэсцкай крэпасці з 45 работамі. Таксама ладзіліся і працягваюць праводзіцца выстаўкі мастакоў студыі на іх малой радзіме.

Актыўна праяўляюць сябе ў праектах Беларускага саюза мастакоў і маладыя яго прадстаўнікі. **Мастачка Марыя КРУЧКОВА**, якая ўваходзіць у маладзёжную секцыю творчай супольнасці, адзначыла, што культура і мастацтва лепш за ўсё спраўляюцца з патрыятычным выхаваннем падрастаючых пакаленняў, але ў гэтым працэсе вельмі важна выбіраць правільныя метады.

— На мой погляд, мастацтва і павінна выступаць у якасці крыніцы выхавання патрыятызму. Спрадвеку яно спраўлялася з такой задачай. Аднак важна ўлічваць, да чаго найбольшы інтарэс праяўляе цяпер моладзь, на тым і варта акцэнтаваць увагу. Напрыклад, з уласнага вопыту магу сказаць, што зрокава вобразы скульптуры, жывапісу лепш успрымаюцца і больш дакладна фіксуюцца маладымі людзьмі. Я таксама за тое, каб на пастаяннай аснове праводзіліся мерапрыемствы на патрыятычныя тэмы: наведванне музеяў, тэатраў, лекцый, правядзенне экскурсій і выязных пленэраў, — кажа мастачка. — У саюзе мастакоў шмат моладзі прыцягваецца ў праекты. Гэта дапамагае адкрываць для сябе і краіну, і сваю культуру.

**Алена ДРАПКО.**

Дзяржаўны падыход

# СТВАРАЛЬНАЯ АСНОВА ЧАЛАВЕКА І КРАІНЫ

**У Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024—2026 гады культура разглядаецца як адзін з галоўных фактараў самабытнасці беларускага народа, пераемнасці пакаленняў, як аснова для станаўлення і развіцця асобы ў грамадстве. Актуальнасць распрацоўкі дадзенай канцэпцыі абумоўлена неабходнасцю захавання адзінства беларускага народа і забеспячэння далейшай кансалідацыі нашага грамадства, а таксама ўмацавання незалежнай беларускай дзяржавы і фарміравання нацыянальнага чалавечага капіталу. Пра тое, у якіх мерапрыемствах і праектах на тэрыторыі нашай краіны і за яе межамі знойдзе адлюстраванне гэты дакумент, расказалі спецыялісты Міністэрства культуры і шэрагу рэспубліканскіх культурных устаноў сталіцы.**

Адметна таксама тое, што, згодна з дакументам, дзяржава забяспечвае прыярытэтнае развіццё беларускай нацыянальнай культуры, адраджэнне, захаванне і развіццё нацыянальных культурных традыцый, выкарыстанне і распаўсюджванне, папулярызацыю нацыянальных культурных каштоўнасцяў. А беларуская мова прызнаецца адным з фактараў фарміравання нацыянальнага менталітэту.

— Канцэпцыя развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства была створана і распрацавана ў развіццё тых даручэнняў, якія даў кіраўнік дзяржавы ў ходзе Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ў 2023 годзе. І ў снежні мінулага года пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2023 года № 961 дадзеная канцэпцыя была зацверджана, — паведаміла **начальнік упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Іна АДАМОВІЧ**.

## КАЛЯНДАР ПАДЗЕЙ ПЛЮС ПРЭМ'ЕРЫ

Прасоўванне і развіццё нацыянальнай мастацкай культуры і мастацтва з'яўляецца адным з кірункаў Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы. Ён уключае ў сябе такія пазіцыі, як, напрыклад, падрыхтоўку календара культурных мерапрыемстваў, якія прапаноўваюцца для наведвання беларускім і замежным турыстам. Каляндар распрацаваны Міністэрствам культуры, і азнаёміцца з ім можа любы чалавек на сайце ведамства.

Яшчэ спецыяліст Міністэрства культуры адзначыла, што адпаведна з дакументам вядзецца падрыхтоўка да святкавання календара значных падзей у духоўным жыцці беларускага народа пры садзейнічанні Беларускай праваслаўнай царквы. Не абмінулі ўвагай і тэму прысутнасці фільмаў беларускай вытворчасці ў рэпертуары кінапракатных арганізацый. Іх колькасць павінна складаць не менш чым 10 % ад агульнай колькасці кінасеансаў у год. Прадугледжана і арганізацыя конкурсных праграм, фільмаў, створаных дзецьмі і моладдзю ў рамках кінафестываляў.

Папоўніцца прэм'ерамі па творах беларускіх аўтараў і рэпертуары тэатральна-відовішчных арганізацый. Напрыклад, нядаўна НАДТ імя Янкі Купалы прадставіў спектакль «Пісаравы імяніны» па п'есе Уладзіслава Галубка. А вось у НАДТ імя Максіма Горкага працуюць над падрыхтоўкай сучаснай трагедыі па дакументальных творах Галіны Злабенка пра людзей, якія перажылі акупацыю, нястачы, страты, але не страцілі галоўнае — чалавечнасць.

— Па-першае, гэты матэрыял эмацыянальна моцны, а па-другое, ён накіраваны не столькі на стварэнне нейкага відовішча, колькі на вывучэнне чалавека, яго лёсу, яго месца ў гэтым свеце ў перыяд надзвычай цяжкіх выпрабаванняў... Тэатр — мастацтва, якое служыць захаванню гуманістычных ідэалаў, накіраванае на стварэнне і духоўнае развіццё грамадства. І тэма прасоўвання і развіцця нацыянальных мастацкай культуры і мастацтва дае глебу для разважанняў. Наш тэатр з'яўляецца адным з лідараў сярод беларускіх тэатраў па прэзентацыі беларускай нацыянальнай культуры за мяжой. На працягу васьмі гадоў мы з'яўляемся пастаяннымі ўдзельнікамі спецыяльнага праекта «Вялікія гастролі» Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі. Амаль штогод з 2016-га тэатр выязджае на гастролі па гарадах Расіі адразу з некалькімі пастаноўкамі. Таксама амаль кожны тэатральны сезон мы прадстаўляем нашу краіну на розных міжнародных тэатральных форумах: Фестываль рускіх замежных тэатраў у Набярэжных Чаўнах, Міжнародны фестываль Дастаеўскага ў Вялікім Ноўгарадзе і іншых, — расказаў **мастацкі кіраўнік НАДТ імя Максіма Горкага Сяргей КАВАЛЬЧЫК**. — Прыязджаеш у Маскву ці ў Санкт-Пецярбург на фестываль, і людзі кажуць: «Мы помнім вашага «Макбета» з Луцэнкам, Янкоўскім і Клімавай у галоўных ролях». Спектакль зняты з пракату недзе ў пачатку 90-х гадоў. А памяць пра яго і дагэтуль жыве ў Расіі. Гэта і ёсць прыклад прасоўвання нацыянальнай культуры, мастацтва.

## КУЛЬТУРА Ў «ЛІЧБЕ» І ІНТЭРАКТЫВЕ

Добрая навіна для прыхільнікаў беларускай культуры і ў тым, што варта чакаць у найбліжэйшай перспектыве з'яўлення электроннага інфармацыйнага рэсурсу «Культура.бел», на якім плануюць размяшчэнне класічных узораў беларускага мастацтва. І сёлета планы ў творцаў таксама вялікія.

Вялікі тэатр цяпер вярнуўся да практыкі фарміравання малых формаў паказаў спектакляў і па магчымасці іх прыстасавання да тых альбо іншых сцэн — для таго, каб максімальна прыцягнуць гледача з усёй краіны і паказаць нашы спектаклі, няхай у адаптаваных варыянтах, ва ўсіх нашых абласных цэнтрах. Мы ўнеслі пэўную карэкціроўку ва ўласную канцэпцыю развіцця Вялікага тэатра ў цэлым шэрагу пазіцый, якія закранулі і пашырэнне нацыянальнай тэматыкі, і працу з моладдзю, — падзялілася **генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Кацярына ДУЛАВА**. — Яшчэ адна важная думка датычыцца, безумоўна, прыцягнення нацыянальных кадраў. Сёння мы знаходзімся ў фармаце існавання санкцый, і гэта накладвае пэўныя патрабаванні на магчымасць залучэння і артыстаў, і рэжысёраў, і дырыжораў, і пастаноўшчыкаў з іншых краін. Але санкцыі — гэта час магчымасцяў, якія мы цяпер актыўна пачынаем выкарыстоўваць, прыглядаемся да той моладзі, што ідзе за намі і бачыць, што адбываецца ў свеце. Моладзь мае імкненне працаваць для сваёй краіны, але ў яе пакуль што няма вопыту і, можа, у поўнай меры разумення, як варта рухацца, і наша задача падказаць. Гэты працэс няпросты. Але без яго ў нашых структур не будзе будучыні. Таму неабходна працаваць у дадзеным кірунку.

Што датычыцца вялікіх прэм'ер, то ў тэатры рыхтуюцца прадставіць гледачу ў чэрвені вялікі патрыятычны праект пад назвай «Патэтычны дзённік памяці» на музыку беларускіх кампазітараў амаль за апошнія 50 гадоў, які складаецца з напісаных для Вялікага тэатра оперных і балетных сачыненняў.

## НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА...

У сваю чаргу **мастацкі кіраўнік Беларускай дзяржаўнай філармоніі Юрый ГІЛЬДЗЮК** акцэнтаваў увагу на тым, што вельмі радасна мець магчымасць працаваць дзеля захавання і падтрымкі традыцыі беларускага музычнага мастацтва:

— Вядома, калі б не развівалася класічная музыка, і школа кампазітарская, і школа выканання нашай краіны, то мы наўрад ці здолелі б стварыць столькі калектываў у Беларускай дзяржаўнай філармоніі, захаваць іх і зрабіць культурным здабыткам нашай культурнай прасторы. І мы чакаем яшчэ большага развіцця і зацікаўлены ў прытоку, у тым ліку і маладых таленавітых людзей. Філармонія кожны сезон прадстаўляе шмат прэм'ер беларускай музыкі. Прыклады апошніх гадоў — Алег Хадоска, Галіна Гарэлава, Вячаслаў Кузняцоў і іншыя кампазітары. Напярэдадні адкрыцця нашай 39-й «Мінскай вясны», прысвечанай 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, мы ганарымся, што ў нас мірнае неба і што мы можам тварыць. І мы ўсе разам працуем з калегамі на стварэнне.

**Алена ДРАПКО.**

# ВОБРАЗЫ ВЯЛІКАГА

## Кніга, якая праз гісторыю тэатра заглыбляе ў гісторыю краіны



**Варта пачуць «Заздраўную» Вердзі — і разумееш, што гэта пра мастацтва і гэта пра жыццё. І пра жыццё мастацтва — калі прыгожыя галасы зорак беларускай оперы гучаць на прэзентацыі кнігі «Вялікі тэатр Беларусі. Падарожжа ў часе», якую прадставіў калекцыянер і гісторык Уладзімір Ліхадзедаў, аўтар праекта «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага». Фаліянт, прысвечаны Нацыянальнаму акадэмічнаму Вялікаму тэатру оперы і балета Беларусі, стаў 50-м выданнем у рамках праекта, якому сёлета спаўняецца 20 гадоў. Прыгожы юбілей: адметным атрымалася як само выданне, так і яго прэзентацыя ў рамках XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Артысты, што прыйшлі падтрымаць сваім талентам аўтара кнігі і родны тэатр, які спрычыніўся да выдання, разумелі: гэта не толькі пра тое, чым жывуць яны, але і пра тое, што было істотна ў мастацтве Беларусі амаль цягам стагоддзя.**



### АД ЗАДУМЫ

Летась Вялікі тэатр Беларусі адзначыў свой 90-гадовы юбілей з моманту адкрыцця творчай установы. Падчас леташніх імпрэз, прысвечаных юбілею, у тэатры была арганізавана выстаўка гістарычных фотаздымкаў, якія выклікалі асаблівую цікавасць, бо яны паказалі будынак, у якім трупа існавала ў розныя часы — пачынаючы ад таго моманту, калі навокал амаль нічога не было... Выстаўка гістарычных фотаздымкаў з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава была падарункам тэатру: дала магчымасць пабачыць матэрыялы, якія яшчэ ніколі не паказваліся шырокаму колу гледачоў. Але гэта была цудоўная магчымасць паглыбіцца ў гістарычны свет не толькі самога будынка, але і кантэксту, у якім ён пражываў свае гады. Ужо падчас адкрыцця выстаўкі адзначалася: гэта зусім малая частка фотаздымкаў з мінуўшчыны Вялікага, якія былі б цікавыя як тэатралам, так і аматарам гісторыі наогул. Тады ж прагучалі абяцанні значна больш гісторыі адлюстраваць у кнізе, прысвечанай тэатру. І вось яна...

— Наша супрацоўніцтва з тэатрам пачалося напярэдадні падрыхтоўкі да юбілею, калі мы дамовіліся пра фотавыстаўку з генеральным дырэктарам Вялікага тэатра Беларусі Кацярынай Дулавай. Падчас размовы я выказаў прапанову, што можна было б яшчэ зрабіць адмысловае выданне, адлюстраваўшы гісторыю тэатра. Яна зацікавілася, — згадвае Уладзімір Ліхадзедаў, праект якога раней быў адзначаны прэміяй «За духоўнае адраджэнне» і ўжо ў 2023—2024 гадах — прэміяй Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва. — Летась на выстаўцы мы змаглі паказаць няшмат здымкаў, пры тым што архіў фота па тэатры ў мяне даволі багаты. Насамрэч большая частка архіва трапіла цяпер у кнігу. Зноў-такі вырашылі паказаць не ўсё, таму што хацелася зрабіць выданне не падобнае на іншыя, якія ўвайшлі ў праект, каб яно было ўнікальным і прыгожым, як сам тэатр, як чараўніцтва, якое ён умее ствараць. Думаю, гэта ў нас атрымалася.

### ДА ЎВАСАБЛЕННЯ

Атрымалася ў тым ліку дзякуючы **загадчыцы сектара фатаграфічных даследаванняў Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Святлане ХАРУЖЫК**, якая працавала над тэкставай часткай. Але тэкст тут «працуе» асаблівым чынам. Ён не столькі аўтарскі, не ўяўляе сабой прыватнага меркавання, з якім можна было б пагадзіцца ці не. Тэкст таксама прадстаўляе гісторыю: аўтары пастараліся скласці кнігу з матэрыялаў-першакрыніц: цытат з газет, публікацый у перыядычным друку, віншаванняў...

— Мы хацелі, каб чытач паглыбіўся ў атмасферу таго часу, напрыклад 30-х гадоў, калі адкрываўся тэатр, — пра гэта тады можна было даведацца, прынамсі, з газет (і мы даём такую магчымасць!), — тлумачыць Уладзімір Ліхадзедаў. — Святлана Харужык шмат папрацавала ў бібліятэках і архівах: у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Вялікім Ноўгарадзе, Пскове... Не толькі ў Мінску, а нават у далёкіх ад Беларусі гарадах мы знаходзілі шмат цікавага матэрыялу, што датычыцца нашага Вялікага тэатра. Гэты матэрыял мы апрацоўвалі, тэкст складалі сумесна — недзе спрачаліся, шукалі паразуменне. Часам аднаму аўтару трэба пачуць іншае меркаванне, каб паглядзець на штосьці збоку і зрабіць выснову, як лепш. Я лічу, што ў многім дзякуючы Святлане гэтая кніга выйшла сапраўды прыгожай. Тэатр таксама быў далучаны да працэсу, але шмат у чым даверыўся нашаму досведу і аўтарытэту. Але паколькі трэба было ўлічваць тэатральную спецыфіку, то ў пытаннях рэдагавання мы цалкам спадзяваліся на прафесіяналізм супрацоўнікаў Вялікага, за што я хацеў бы падзякаваць Таццяне Аляксандравай. Да таго ж, акрамя гістарычных фота з маёй калекцыі, мы скарысталі здымкі розных гадоў, якія даў тэатр, — адбіралі самыя прыгожыя. А таксама рабілі панарамныя сучасныя здымкі, каб больш шырока ахапіць прастору. Праца была складаная, але лічу, што гэта адна з маіх найлепшых кніг. І Кацярына Мікалаеўна Дулава яе ацаніла вельмі высока. Таму прэзентацыя атрымалася незабыўнай — з удзелам зорак тэатра.

«Вялікі тэатр Беларусі. Падарожжа ў часе» — гэта не проста адбіткі мінуўшчыны, а адлюстраваная ў руху рэальнасць, бо нішто не захоўвае моманты гісторыі больш відавочна, чым фотаздымкі, па якіх бачныя пражытыя гады і змены, якія адбываліся цягам часу.

### АД ЗНЕШНЯГА

Чытач можа ўявіць гэтыя змены ў першую чаргу ў ландшафце: усе мы ведаем, што ўяўляе сабой Вялікі тэатр і парк каля яго сёння, але можам зразумець, з чаго ўсё пачыналася, калі ў Мінску на рынкавай плошчы на Троіцкай гары быў закладзены будынак. Работы пачаліся летам 1933 года, калі стала зразумела: Дзяржаўная студыя оперы і балета здольная прадстаўляць паўнавартасныя спектаклі, і ёй патрэбны ўласны дом (першапачаткова трупа карысталася сцэнай Беларускага драматычнага тэатра, які мы ведаем як Купалаўскі). Той будынак, што бачым мы, быў спраектаваны Іосіфам Лангбардам у стылі канструктывізму. Свае смелыя задумы архітэктар здолеў рэалізаваць менавіта ў Беларусі, вярнуўшыся сюды з Ленінграда. Яго праца над аб'ектамі ў Мінску была адзначана на міжнародным узроўні — у 1937-м годзе Лангбард атрымаў Гран-пры Сусветнай выстаўкі ў Парыжы. Але тэатр на той час быў яшчэ ў працэсе будаўніцтва.

Будавалі трывала: адкрыццё опернага тэатра ў Мінску адбылося 10 сакавіка 1939 года — на новай сцэне прадставілі прэм'еру нацыянальнай оперы «Міхась Падгорны» кампазітара Яўгена Цікоцкага. Такім чынам сёлета тэатр оперы і балета Беларусі адзначае яшчэ адзін своеасаблівы юбілей — 85 гадоў споўнілася ўласна будынку.

Нягледзячы на тое што першапачатковы праект Лангбарда падчас працы быў зменены, вынік усё адно атрымаўся грандыёзны: наш Вялікі і цяпер — самы вялікі тэатр краіны з пункту гледжання сцэны і глядзельнай залы. Будынак выстаяў падчас вайны, праўда, быў разрабаваны (тут размясцілі стайню) і атрымаў пашкоджанні, як і іншыя аб'екты архітэктара ў Мінску. Уяўленне пра тэатр на пачатку яго існавання даюць унікальныя здымкі, нават паваеннага часу.

Пасля вызвалення горада Іосіф Лангбард быў сярод тых рупліўцаў, якія прыклалі намаганні да аднаўлення архітэктурнага вобраза сталіцы Беларусі, але найбольшы аб'ём работ вытрымаў менавіта будынак Вялікага тэатра, які перажыў рэканструкцыю. Ярусы ў глядзельнай зале з'явіліся менавіта тады. Гледачы запоўнілі тэатр ізноў у 1947 годзе. Ужо пасля вайны дзякуючы Лангбарду вакол тэатра з'явілася маляўнічае асяроддзе: ён распрацаваў план парку, у якім з задавальненнем гуляюць мінчане і госці горада.

Пазнейшыя рэканструкцыі таксама зрабілі свой унёсак у аблічча тэатра. Напрыклад, дах у выглядзе шлема быў над будынкам не заўсёды, а з'явіўся ў 60-я гады. Рэканструкцыя і рэстаўрацыя ў пачатку 2000-х абапіраліся на гістарычныя дакументы ды фота і дадалі аздаблення, а таксама пашырылі магчымасці сцэны згодна з сучаснымі патрабаваннямі. Таму што тэатр — гэта найперш спектаклі, якія ў ім ідуць.

### ДА НЯЗГАСНАГА

